УДК 821.161.3

# ТВОРЧА-ЭСТЭТЫЧНАЯ ТРАНСФАРМАЦЫЯ ВОБРАЗА-СІМВАЛА ВАСІЛЬКА Ў ТВОРЧАСЦІ БЕЛАРУСКІХ ПАЭТАЎ

***Н. М. Борсук***

УА «Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт», Брэст, Беларусь,
borsnina@yandex.by

**Анатацыя**

У артыкуле прасочваецца творча-эстэтычная трансфармацыя вобраза-сімвала васілька ў творчасці беларускіх паэтаў, высвятляецца семантычны патэнцыял аб’екта прыроднага асяроддзя; вызначаецца роля кветкі валошкавага колеру як універсальнага сродку для сімвалізацыі розных сітуацый і з’яў; для выяўлення псіхаэмацыянальнага стану душы чалавека. Нашы сучаснікі сцвярджаюць: перш чым зразумець тую ці іншую ісціну, чалавек павінен адчуць яе значнасць у форме прыгожага.

**Ключавыя словы:** васілёк, семіятызацыя, інтэрпрэтацыя, сімвал, фальклорная традыцыя.

# CREATIVE AND AESTHETIC TRANSFORMATION OF THE SYMBOLIC IMAGE OF THE CORNFLOWER IN THE WORKS OF BELARUSIAN POETS

***N. N. Borsuk***

**Abstract**

The article traces the creative and aesthetic transformation of the symbolic image of the cornflower in the works of Belarusian poets; the semantic potential of the object of the natural environment is clarified; the role of the cornflower as a universal means of symbolizing various situations and phenomena is determined; the role of the flower in revealing the psychoemotional state of the human soul is defined. Our contemporaries claim that before understanding a particular truth, a person must feel its significance in the form of beauty.

**Keywords:** Cornflower, semiotization, interpretation, symbol, folk tradition.

**Уводзіны.** Аб’ектам даследавання з’яўляецца раслінная сімволіка, на прыкладзе кветкі «васілёк», як элемента ўніверсальнага знакавага комплексу. Вобраз-сімвал васілька праходзіць праз усю беларускую паэзію, але ёсць паэты, чыя творчасць асабліва ярка ім пазначана. Найперш, бясспрэчна, гэта М.Багдановіч, які называе кветку «мой дружа» (верш «На чужыне»).

Канцэпцыя фарміравання сімволікі беларускай нацыянальна-фальклорнай традыцыі, якая адыгрывае важнейшую сэнсава-кампазіцыйную ролю ў літаратурных тэкстах, дастаткова актуальна ў сучасным літаратуразнаўстве і вызначаецца нераспрацаванасцю шырокага кола праблем у галіне фалькларыстыкі, семіётыкі, этналінгвістыкі, культуралогіі і іншых гуманітарных навук, звязаных з даследаваннем знакавай арганізацыі свету пры дапамозе раслінных сімвалаў; асэнсаваннем уяўленняў чалавека пра мікра-і макракосмас.

Сімвалы кветак траплялі ў поле зацікаўленняў шэрагу даследчыкаў, якія выказвалі розныя меркаванні наконт генезісу (паходжання, станаўлення і развіцця) і семантыкі раслін. Так, праблему ўшанавання расліннага свету славянамі асэнсоўваў А. Ненадавец [11], М. Малоха [9], І. Швед [16. 17], І. Чарота [15]. Л. Салавей звярнула ўвагу на тое, што «шэраг раслінных вобразаў, якія арганічна ўключаны ў беларускі фальклор, не выкліканы рэаліямі прыроднага асяроддзя, а прынесены здалёк, захаваны ў эпічнай памяці народа» [13, с. 126]. «Філалагічны» бок сімволікі вобразаў некаторых раслін аналізаваў Н. Гілевіч у грунтоўнай працы «Паэтыка беларускай народнай лірыкі. Слова і вобраз» [5]. Калі пытанні, звязаныя з даследаваннем сімволікі дзікарослых дрэў, больш-менш распрацаваны, то фітонімы як спецыфічны культурны (этнаграфічны, філалагічны, мастацтвазнаўчы, рэлігійны) феномен, застаюцца не вывучанымі. Прапанаваны матэрыял – гэта спроба далучэння да вырашэння акрэсленай праблемы.

Мэта нашай працы – прасачыць творча-эстэтычную трансфармацыю вобраза-сімвала васілька ў творчасці беларускіх паэтаў. Мэта рэалізуецца праз вырашэнне наступных задач: высветліць семантычны патэнцыял аб'екта прыроднага асяроддзя – кветкі «васілёк»; вызначыць ролю кветкі валошкавага колеру як універсальнага сродку для сімвалізацыі розных сітуацый і з'яў; для выяўлення псіхаэмацыянальнага стану душы чалавека.

**Матэрыялы і метады.** Высновы абапіраюцца на філасофскую тэорыю сімвала [17, с. 6]: разуменне мастацкага сімвала як дыялектычнага адзінства прадмета, вобраза і яго ўнутранага значэння, грунтуюцца на выкарыстанні параўнальна-тыпалагічнага метаду, абумоўлены міфалагічнай семантыкай і функцыямі травяністай расліны «васілёк лугавы», якая расце выключна як пустазелле ў збожжы, пераважна ў азімым жыце і пшаніцы.

Здаўна ў народзе ўжываецца назва «васілёк» і «валошка». Асаблівая ўвага фальклярыстамі надавалася сіняму колеру кветкі, які яны суадносілі з ніжнім ярусам светабудовы, з замагільным светам смерці. Сяляне верылі, што будзе «не вельмі добры год», калі бачылі ў полі вялікую колькасць васількоў. Прысутнасць у расліне сіняга давала права фалькларыстам праводзіць паралель з воднай стыхіяй. Сапраўды, народ верыў у лекавую сілу васілька і ўключаў яго ў купальскі збор кветак, які абавязкова асвячалі ў Іванаў дзень у царкве. Б. А. Успенскі [14, с. 131] звязвае этымалогію назвы «валошка» з богам Вялесам. Васілёк па сцверджанні Е. Р. Раманава [12, с. 204–406] займае прыкметнае месца ў абрадзе «провадаў русалкі». На Украіне нават існуе легенда, згодна якой кветка васілёк з'явілася з прыгожага хлопца, ператворанага русалкай на Русальным тыдні. У даўнія часы васілёк уплялі ў вянок маладой. Зыходзячы з гэтага, маем права разважаць пра сакральны сэнс кветкі.

Радкі народных лірычных песень гавораць аб тым, што васілёк успрымаўся нашымі продкамі як сімвал прыгажосці («Пайду я ў садочак, // Сарву я васілёчак, // Васілёчак сіненькі, // Мой дзядулька міленькі, // Васілёчак найсінейшы, // Мой дзядулька наймілейшы»), як сімвал нечага абсалютна дасканалага, добрага, надзейнага («Німа сінейшага цвету ды над васілёчка, Ды

над васілёчка, // Німа вярнейшага слоўца над міла дружочка, над міла дружочка») [10, с. 72].

**Вынікі і абмеркаванне.** Апаэтызаваны ў фальклоры сціплы васілёчак знаходзіць сваё месца ў беларускай прафесійнай паэзіі. Асаблівае месца яму нададзена ў творчасці М. Багдановіча. Лёс гэтай прыгожай, сціплай, палявой кветачкі сугучны душэўнаму настрою паэта. Васілёк ніхто не сее, ён расце сам па сабе. Гэта, на першы погляд, непрыкметная кветка, але чароўная. Падобна васільку выспяваў і талент М. Багдановіча. Нягледзячы на тое, што большую частку жыцця юнак правёў за межамі радзімы, ён жыў з вераю ў адраджэнне Беларусі і не жадаў заўважаць, як адзначаў бацька паэта, «бязрадаснасці і хісткасці матэрыяльных перадумоў для справы нацыянальнага адраджэння» [6, с. 28].

З вобразам васілька глыбока і моцна звязана паэтычнае светаўспрыманне многіх сучасных творцаў [3, с. 69–74], у тым ліку, і паэтаў Берасцейшчыны. Напрыклад, творчасць Н. Мацяш, з яе ж слоў, развівалась «пад знакам васілька». «Само лета ў імені тваім. / Само лета. / Цэлы лёс наш аказаўся ім / Абагрэты» (верш «Васілёк»).

Зусім відавочна, што васілёк з часоў М. Багдановіча ўспрымаецца ў беларускай паэзіі як сімвал Радзімы і жывой мовы роднай зямлі. Менавіта з сябрам-васільком лірычны герой верша «На чужыне» вядзе маўклівую размову «аб беднай далёкай сваёй старане». І пачуццё адзіноты знікае. Сінявокая Беларусь стала адзінай надзейнай абранніцай сэрца паэта. На гэта ў свой час указваў І. Замоцін [6, с. 111]. Жыццё чалавека неаддзельна ад лёсу Радзімы. Для сцверджання гэтага лірычнай гераіні Н. Мацяш спатрэбіўся «васільковы» матыў: «Як не выйду больш на васільковы / Я парог – / Пагукай бязмежжа гэтых словаў / Чатырох» (верш «Vita brevis. Patria eternis»).

У апісанні і выяўленні сваіх пачуццяў да роднага краю М. Багдановіч звяртаецца да колеру васілька, – зазначаў літаратуразнаўца А. Майсейчык. Ён быў перакананы, што «ад колеру гэтай кветкі звязана ў М. Багдановіча ўспрыманне родных краявідаў («Змяіны цар», «Зімняя дарога»). З гэтым колерам асацыіруецца ноч і нават маладзік («Ціха па мяккай траве», «Зімой», «Вечар на захадзе ў попеле тушыць»). Сіні колер выклікаў успаміны аб маладосці, каханні («Набягае яно», «Маладыя гады»). Эпітэт сіні ўжыты ў апошнім развітальным вершы М. Багдановіча («У краіне светлай...»)» [8, с. 27].

Нельга не заўважыць, што валошкавы колер становіцца важным чыннікам паміж лірычным героем і яго каханай у творчасці шэрагу маладых паэтаў, якія звярнуліся да традыцый М. Багдановіча. Для героя трагедыйна-баладнага верша М. Пракаповіча «Марыя» галоўным у каханні застаецца духоўнасць і найвялікшае шчасце – памяць пра «сінь валошак», што «разліта ў жыцце» і адбіваецца «ў родных вачах». Ва ўмовах адраджэнскага руху нават каханне ўзбагачаецца, узвышаецца адухоўленае ідэаламі свабоды, справядлівасці, братэрства, – заўважаў У. Калеснік. «Гэта здаровая духоўнасць» [7, с. 221].

У эстэтычнай канцэпцыі М. Багдановіча васілёк – гэта яшчэ і ўвасабленне лёсу беларускай нацыі. Герою верша «На чужыне» цяжка змірыцца са становішчам сваіх суайчыннікаў у свеце. Праз словазлучэнні «шэпча панура»,

«шэпча нявесела», «забыты васілёк» паэт перадае хваляванне за будучыню беларускага народа, які стварыў багатую духоўную спадчыну, дасканалую мову, але, на жаль, пазбаўлены магчымасці ёю карыстацца. Народ, мужны, смелы, дужы, загартаваны стагоддзямі няспынных войнаў, бачыцца паэту цярплівым, пасіўным, асабліва калі размова ідзе пра яго асабісты лёс ці лёс цэлага грамадства. Ён чулы, спагадлівы да чужой бяды, але часта пануры, схільны да сацыяльнай апатыі. Не кожнага і не заўсёды беларус дапускае ў свой унутраны свет. Таленавіты, мяккі, гасцінны, ён, аднак, з недаверам можа паставіцца да чужых ідэй.

Трывога за будучыню Беларусі, роздум аб лёсе народа кіруе і паэтамі Берасцейшчыны, прымушае іх звяртацца ў творчасці да гістарычных матываў. Напрыклад, праз постаць берасцейскага ваяводы Ціта М. Пракаповіч асэнсоўвае маральна-этычную праблему вернасці і здрады: «Змыюць кроў з зямлі дажджы і росы, / Ды гайдае летапісны час / Кавылі – / ў чужых вачах раскосых. / І валошкі – / ў Цітавых вачах» (верш «Мяжа надзеі»). Сутнасць жыцця беларускага воя, лірычнага героя М. Пракаповіча выразна раскрыта праз супастаўленне вобразаў кавыля і валошкі. Вернасць Бацькаўшчыне, імкненне вызваліць родную зямліцу паэт атаясамлівае з васільком.

Пазіцыя лірычнага героя верша «На чужыне» супадае з пазіцыяй аўтара зборніка «Так і не» З. Дудзюк [2, с. 41–45]. Назва паэтычнай кнігі даволі сімвалічная. «Так», – гераіня вымушана жыць сярод людзей, якія «бязмоўем пакараны», у ачарсцвелым грамадстве, дзе клопат аб духоўным развіцці нацыі існуе больш на словах. Але і сваім «не» паэтэса сцвярджае: так не павінна быць і не будзе. Каб чалавек не стаў «бязродным валацугам», ён павінен авалодаць самабытнай спадчынай свайго народа: «...у песнях нашых і паданнях. / У мудрых думах слаўных песняроў, / У васільку, у галашэнні кані, / У гаманлівай рэчкі пад гарой...» (верш «Наступнік мой, што на мяжы стагоддзяў...»). У працытаваных вышэй радках выразна акрэслена сутнасць скарбу, які лірычны герой верша павінен пранесці праз усё жыццё.

Агульначалавечыя і нацыянальныя праблемы арганічна паяднаны ў творчасці Яна Збажыны. Дзеля гэтага ён выкарыстоўвае цвёрдую жанравую форму – танка. У танка «Дзве ружы ў вазе» позірк паэта скіраваны да васілька, сціплай палявой кветачкі блакітнага колеру. У ёй увасоблена беларуская душа, якая ў розныя гістарычныя часы пакутавала, але заўсёды з надзеяй імкнулася ў будучыню: «Зайздрошчу яму // І выплюхваю ваду. // Засмяглыя – завянуць!» Апошні радок танка – гэта і сцверджанне, і адначасова перасцярога тым, хто не разумее, што перакройванне свядомасці асобы пачынаецца з нігілістычнага адштурхоўвання таго, што здабыта бацькамі.

Спрадвеку квітнее васілёк на беларускіх палетках. Нябесным колерам вылучаецца ён сярод залацістага жыта, як напамінак людзям, што не хлебам адзіным жыве чалавек. «Добра быць коласам; але шчаслівы той, каму дадзена быць васільком. Бо нашто каласы, калі няма васількоў?» – пытае М. Багдановіч ад імя Хрыста ў празаічным творы «Апокрыф». Гэтак і Беларусь з яе багатаю культураю займае адметнае месца на сусветным небасхіле. Разам з М. Багдановічам мы захапляемся працаю слуцкіх ткачых. Іх залатыя паясы былі

народжаны «самой гармоніяй прыроды, жывой красой неба, жытняга поля, ракі, лесу» (верш «Слуцкія ткачыхі»), любоўю да роднай зямлі, дзе «блішча збожжа ў яснай далі, сінеюць міла васількі».

Багдановічаўскі «цвяток радзімы васілька» становіцца сімвалам духоўнага аблічча Беларусі і нацыянальнага мастацтва. «Васілёк сімвалізуе духоўнасць, дасканаласць, якая цешыць душу народа, бо ні нядоля, ні цяжкая праца не азначаюць, што толькі хлеб надзённы, толькі наедак цялесны патрэбны чалавеку на яго зямным шляху» [1, с. 46]. Васілёк, па перакананні Н. Мацяш, – вось вымярэнне жыцця, яго радасць. Для яе гераіні жыццё асацыіруецца з жытнёвым полем, поўным васількоў: «Расхінуцца раптам каласы – / Проста ў вочы / Таямніцай смутку і красы – / Васілёчак» (верш «Васілёк»).

Гераіня З. Дудзюк сэнс свайго існавання бачыць у служэнні Бацькаўшчыне, у пачуванні сваёй знітаванасці з агульначалавечымі клопатамі і справамі: «Поле – перш з васільком, / А пасля толькі – з хлебам» (верш «Залежнасць»).

Неспакой за чалавечае быццё, за спусташэнне людскіх сэрцаў ахоплівае і лірычнага героя зборніка А. Каско «Час прысутнасці». Немагчыма суладдзе ў свеце, калі «звяў васілёк»... Лірычны герой добра разумее, што будуць пакуты, выпрабаванні, але ён верыць у духоўныя сілы чалавека.

Усведамленне духоўнай еднасці з роднаю зямлёю і  красою яе прыроды праз кветку блакітнага колеру дае мажлівасць паэтам глыбей заглянуць у свой асабісты ўнутраны свет. Вобраз васілька ўвасабляе абвостраную цягу людзей да ідэалу, чысціні і прыгажосці, тугу па гармоніі. Гераіня верша Н. Мацяш «У вераснёвым полі» трывожыцца за лёс людзей, прагне шчодрай людской супольнасці. Неспадзяваная сустрэча з прыгожаю палявою кветачкаю прымушае яе, а разам з ёю і нас, вучыцца нанова адкрываць, «хто мы ёсць адзін для аднаго».

Як бачна, для многіх сучасных паэтаў кветка васільковага колеру стала сімвалам духоўнай радзімы, той зямлі, якая надае сілы паэтам пераносіць усе цяжкасці і нягоды. Н. Мацяш упэўнена, што васілёк стане для новага пакалення надзейным духоўным арыенцірам, які  дапаможа ім знайсці сябе ў плыні дзён: «Я азіраюся: твой сын малодшы / На ўзмежжы, колючыся аб асцё, / Збірае ў жменьку цёплыя валошкі»...(«У вянок Любе»).

Сучасныя паэты праз вобраз-матыў васілька здолелі рэалізаваць філасофска-эстэтычныя ідэі аб духоўным удасканаленні асобы, аб цыклічнасці чалавечага  жыцця, аб несумненным адраджэнні роднага краю, аб неабходнасці кожнаму чалавеку ў яго жыцці імкнуцца да ідэалу, ці, калі гаварыць словамі І. Багдановіч, «адкрываць някідкія, няяркія праявы рэчаіснасці і духу і ўзводзіць іх да найвышэйшай ступені мастацкага хараства» [1, с. 45].

Як сведчаць нашы назіранні, прырода, уведзеная ў эстэтычны культ М. Багдановічам, і на сённяшні дзень з’яўляецца крыніцай натхнення для многіх паэтаў. Гармонія прыроднай красы стала неад’емнай часткай паўнавартаснага духоўнага жыцця чалавека. Сваёй творчасцю паэты наглядна дэманструюць і сцвярджаюць, што інтэлектуальнае багацце асобы абумоўлена здольнасцю ўспрымаць красу прыроды. Духоўнае развіццё чалавека было б назаўсёды спынена, калі б у прыродзе раптоўна знікла шматколернасць, багацце формаў,

разнастайнасць гукаў. Праз далучэнне чалавека да хараства беларускай прыроды сучасныя паэты імкнуцца духоўна аб'яднаць людзей у часе і прасторы, пераадолець манкуртства, абудзіць гістарычную памяць, спрыяць фарміраванню аптымістычнага светаўспрымання, эмацыянальнай чуйнасці, душэўнай далікатнасці і вытанчанасці... Заслуга нашых сучаснікаў заключаецца ў тым, што ўслед за М. Багдановічам яны вучацца «адбіраць для вобразнага пераўвасаблення нібыта ўсё другараднае, тое, што іншыя проста не заўважалі, і ствараць цудоўную лірычную гармонію» [1, с. 47]. Услед за класікам нашы сучаснікі выразна ўсведамляюць: перш, чым зразумець тую ці іншую ісціну, чалавек павінен адчуць яе значнасць у форме прыгожага. У выніку актывізуецца фарміраванне гуманістычнай асобы.

**Заключэнне.** Як бачна, і фалькларысты, і сучасныя паэты сваю задачу бачылі не ў вывучэнні і апісанні мясцовай фауны, а ў выяўленні праз вобраз васілька багатага дыяпазона думак, перажыванняў, пачуццяў, пачынаючы ад глыбока патрыятычных, агульначалавечых да асабіста інтымных. Гэта, безумоўна, спрыяе філасофскаму, ідэйна-эстэтычнаму паглыбленню сучаснай паэзіі. Мастакі слова выкарысталі вобраз сімвал валошкі для апісання карціны свету традыцыйнага грамадства. Супастаўленне этнаграфічных дадзеных з інтэрпрэтацыяй іх прафесійнымі творцамі сведчыць аб пераемнасці традыцый. Невыпадкова ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» выдадзены анталагічны зборнік мастацкіх твораў пра кветку, што любіць жытнёвае мора, – «Валошка і васілёк» (серыя «Нашы сімвалы»). Такога роду выданні дазваляюць правадзіць даследаванні антрапалагічнай накіраванасці, засяродзіць увагу чытача на асэнсаванні праблемы ўзаемаадносін чалавека і прыроды, а таксама на тым, як пры дапамозе мастацкіх сродкаў выразнасці творца семіятызуе расліну і ўключае яе ў межы свайго свету.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. Багдановіч, І. Э. «Бемолі» М. Багдановіча / І. Э. Багдановіч // Крыніца. – 1999. – № 6. – С. 43–49.
2. Борсук, Н. М. «З пяшчотным даверам да чытача» : нарысы па літаратуры Берасцейшчыны / Н. М. Борсук. – Брэст : БрДТУ, 2015. – 192 с.
3. Борсук, Н. М. Наталіцца святым і адвечным: Традыцыі М. Багдановіча ў сучаснай берасцейскай паэзіі / Н. М. Борсук. – Брэст : Выд-ва С. Лаўрова, 2002. – 264 с.
4. Валошка і васілёк. Анталогія ; уклад. Спрынчан, А. – Мн. : Маст. літ-ра, 2020. – 79 с.
5. Гілевіч, Н. С. Паэтыка беларускай народнай лірыкі. Слова і вобраз / Н.С. Гілевіч. – Мн. : Вышэйшая школа, 1975. – 285 с.
6. Замоцін, І. І. Творы: Літ.-крытычныя артыкулы / Склад. Я. М. Гаварушка; навук. рэд. У. Конан / І. І. Замоцін. – Мн. : Маст. літ., 1991. – 335 с.
7. Калеснік, У. А. Паэтаў лёс і воля–вольніца / У. А. Калеснік // Полымя. – 1994. – № 12. – С. 211–227.
8. Майсейчык, А. А. Эпітэт у паэтыцы М. Багдановіча / А. А. Майсейчык // Беларуская літаратура: Рэспубліканскі міжведамасны зборнік. Вып. 19. – Мн. : Універсітэцкае, 1991. – С. 23–31.

9. Малоха, М. Фразеологизмы с концептом «дерево» в зеркале народной культуры (на материале восточнославянских и польских языков) / М. Малоха. – Мн. : «Тэхналогія», 1998. – 141 с.
10. Міфалогія беларусаў: Энцыкл. слоўн. Склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мн. : Беларусь, 2011. – 607 с.
11. Ненадавец, А. М. Каму пакланяліся продкі / А. М. Ненадавец. – Мн. : Навука і тэхніка, 1996. – 236 с.
12. Романов, Е. Р. Белорусский сборник : Быт белоруса / Е. Р. Романов Вильна, 1912. – Вып. 8. – 550 с.
13. Салавей, Л.М. Вытокі песеннай вобразнасці фальклору ўсходніх славян / Л. М. Салавей // Узроўні агульнасці фальклору ўсходніх славян. – Мн. : Навука і тэхніка, 1993. – С. 24–137.
14. Успенский, Б. А. Филологические разыскания в области славянских древностей: Реликты язычества в востонославянском культе Николая Мирликийского / Б. А. Успенский. – М. : Изд-во МГУ, 1982. – 245 с.
15. Чарота, І. А. Пошук спрадвечнай існасці: Беларуская літаратура XX стагоддзя ў працэсах нацыянальнага самавызначэння / І. А. Чарота. – Мн. : Навука і тэхніка, 1995. – 157 с.
16. Швед, І. А. Дэндралагічны код беларускага традыцыйнага фальклору. / І. А. Швед. – Брэст, 2004. – 301 с.
17. Швед, І. А. Раслінныя сімвалы беларускага фальклора. Манаграфія / І. А. Швед. – Брэст : Выд-ва УА БрДУ, 2000. – 159 с.

УДК 502.75:582;574.34(476)

# ЭКОЛОГО-ФАРМАКОЛОГИЧЕСКАЯ И БИОХИМИЧЕСКАЯ ОЦЕНКА ПЛОДОВ МОРОШКИ ПРИЗЕМИСТОЙ (*RUBUS CHAMAEMORUS* L.) В СЕВЕРНОЙ ЧАСТИ БЕЛАРУСИ

***Е. Г. Бусько, Е. В. Акшевская, А. О. Козорез***

Международный государственный экологический институт имени
А. Д. Сахарова Белорусского государственного университета, Минск, Беларусь,
eu.busko@gmail.com

**Аннотация**

Рассмотрены эколого-фармацевтическая и биохимическая значимость плодов морошки приземистой, а также объяснение причин исчезновения вида с территории Беларуси. Выполнено исследование биохимического состава плодов морошки приземистой в новых ее местообитаниях и выявлены все стороны значимости вида. Являясь ледниковым реликтом, в значительной степени подвергающимся конкуренции со стороны аборигенных и антропофильных видов, пассивные формы охраны морошки предложено дополнить активными, направленными на восстановление и увеличение численности популяции указанного вида в стране на основе разработки и последующего использования биологиче-